№№43–44
(2563–2564)

16 сакавіка 2007 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная воля».
Кошт — свабодны.

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...
Якуб КОЛАС

Да ўвагі!

Хто не зрабіў перадаплату і хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

Наведвайце сайт «Народнай волі»!

Паважаныя чытачы "Народнай волі"!
Знайсці нас у Інтэрнеце можна па адрасе **www.nv-online.info**
Там вы зможаце прачытаць артыкулы апошніх нумароў газеты і абмеркаваць іх, даведацца пра падзеі ў краіне і свеце на стужцы навін, напісаць электронны ліст у рэдакцыю.
Архіў газеты можна паглядзець па адрасе **http://nv.promedia.by**

РАЗБОРКІ

Кантралёры знайшлі самыя дарагія дзверы

У аўторак у Мінску на пасяджэнні ўрада заслухвалася пытанне аб ходзе рэканструкцыі беларускіх тэатраў. Нечакана для многіх абмеркаванне адбылося вельмі вострае.

Старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю **Зянон Ломаць** паведаміў прысутным, што дырэкцыяй будаўніцтва і рэканструкцыі Вялікага тэатра оперы і балета былі дапушчаны вельмі грубыя памылкі пры рэканструкцыі.

"Толькі ўмяшальніцтва Дзяржкантролю дазволіла сэканоміць 260 тысяч еўра на тэндэры па закупцы сцэнічнага абсталявання", — заявіў Зянон Ломаць.

Акрамя таго, па яго словах, *"на адных толькі дзвярах было "адмыта" 300 тысяч долараў"*.

Кіраўнік КДК паведаміў, што яго ведамства зацікавілася тэндэрам па закупцы гэтых самых дзвярэй, на якім, як сцвярджае чыноўнік, перамагла *"падстаўная фірма"*, якая наогул не займаецца вытворчасцю.

"2 мільярды рублёў за дзверы былі пералічаны па перадаплаце, але да саміх дзвярэй ой як далёка", — заявіў Ломаць.

Кантралёры высветлілі, што пералічаныя грошы фірма адразу ж перавяла на дэпазітныя рахункі ў "Пріорбанку".

Да ведама. *Асноўная мэта праграмы рэканструкцыі тэатраў — прывядзенне будынкаў у належны стан і арганізацыя бяспечнай работы, паколькі эксплуатацыя гэтых аб'ектаў звязана з масавым знаходжаннем людзей. Згаданая праграма ахоплівае 24 рэспубліканскія тэатры, у тым ліку тры тэатры рэспубліканскай уласнасці і 21 — камунальнай. Усяго на выкананне праграмы, зацверджанай пастановай урада №604 ад 24 мая 2004 года, прадугледжана выдзяленне больш як 32 млрд рублёў, у тым ліку за кошт сродкаў бюджэту — 7,499 млрд, мясцовых бюджэтаў — 20,86 млрд і горада Мінска — 4,5 млрд рублёў. За мінулыя тры гады (2004—2006) у цэлым па праграме асвоена 15,737 млрд рублёў, што склала 103,9% да плана. Па рэспубліканскім бюджэце праграма выканана на 184,9%. У той жа час аб'ём работ па рэканструкцыі і тэхнічным пераабсталяванні тэатраў камунальнай уласнасці ажыццёўлены толькі на 84,4%. За гэты перыяд не выкананы запланаваныя работы па рэканструкцыі і тэхнічным пераабсталяванні тэатраў у Брэсцкай вобласці (50,5%), Гродзенскай вобласці (17,8%) і ў Мінску (79,9%).*

ДАРЭЧЫ

Некалькі тыдняў таму на прэс-канферэнцыі, прысвечанай асноўным мерапрыемствам Міністэрства культуры Беларусі на сакавік, журналіст "Народнай волі" запытала ў першага намесніка міністра культуры **Уладзіміра Рылаткі**, ці вядомыя яму факты, калі сродкі, выдаткаваныя на рэканструкцыю і тэхнічнае пераабсталяванне тэатраў, былі выкарыстаны не па прызначэнні?

Уладзімір Рылатка — чыноўнік са стажам — вядома ж, адказаў, што такіх фактаў не высветлена: маўляў, у нас кожны рубель на ўліку.

Узнікае пытанне: першы намеснік міністра на той момант яшчэ проста не быў азнаёмлены з вынікамі праверкі Дзяржкантролю ці проста не хацеў выносіць смецце з хаты?..

ЗДАРЭННЕ

У Жлобіне расстралялі сям'ю цыганскага барона

Здарэнне адбылося каля другой гадзіны ночы. У дом па вуліцы Шасейнай, дзе жылі дачка і зяць цыганскага барона, пастукаліся невядомыя. Дзверы адчыніў зяць Людвіг Бур'янскі. Кілер стрэліў у мужчыну, а потым у яго жонку Святлану.

Дачка Бур'янскіх паспела выскачыць на двор праз акно і пабегла да дзядулі — цыганскага барона, які жыў у некалькіх хвілінах ад месца здарэння. Калі прыехалі супрацоўнікі Дэпартамента аховы, муж і жонка былі забітыя.

— На хаўтурах было некалькі тысяч чалавек. Адных машын з украінскімі, малдаўскімі, расійскімі, румынскімі нумарамі з'ехалася некалькі соцень, — кажа сусед забітых Аляксандр. — Уся вуліца была затлумлена цыганамі і гараджанамі. За працэсіяй самі чылі некалькі дзесяткаў міліцыянераў, быццам праводзілася нейкае шэсце ці мітынг. Усё ж цыганскі барон — асоба аўтарытэтная, таму забойства ягоных сваякоў — справа нечаканая.

Па словах суседзяў, сям'я Бур'янскіх займалася перакупкай катэджаў, таму забойства магло быць звязана з бізнесам. Суседзі, праўда, ведаюць няшмат: на вуліцы Шасейнай сям'я пасялілася толькі год таму.

У забітых мужа і жонкі засталася дачка і два непаўналетніх сыны.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

Віктар ІВАШКЕВІЧ:

«Перамены на Беларусі без перамоў з уладай немагчымы...»

25 сакавіка ўсе, як кажа палітык Вінцук Вячорка, "несавецкія беларусы" святкуюць Дзень абвяшчэння Беларускай Народнай Рэспублікі.

Падрыхтоўка да свята вядзецца даўно — загадзя створаны спецыяльны аргкамітэт па падрыхтоўцы і правядзенні Дня волі.

*"Народная воля" вырашыла пацікавіцца ў намесніка старшыні Партыі БНФ і намесніка старшыні аргкамітэта **Віктара ІВАШКЕВІЧА**, якія мерапрыемствы запланаваны на 25 сакавіка.*

— Як мінімум разлічваем на мітынг на Кастрычніцкай плошчы, — адказаў спадар Івашкевіч. — Калі Кастрычніцкая плошча будзе недаступна, то ён адбудзецца ў тым месцы, дзе мы здолеем стаць.

— Дазвол на мітынг атрыманы?

— Заяўка на акцыю пададзена яшчэ месяц таму. Паводле закона, мы павінны атрымаць адказ не пазней як за 5 дзён. Значыць, 19 сакавіка нам мусяць даць канчатковы адказ.

— Скажыце шчыра: маеце надзею на дазвол?

— Мы разглядаем тры варыянты.

Першы — аналаг 19 сакавіка мінулага года. Мітынг не дазволілі, але пры гэтым плошча не была ачэпленая і ўлады не перашкаджалі людзям сабрацца і правесці мітынг.

Другі — падобна на тое, што адбылося 25 сакавіка мінулага года. Плошчу ачапілі міліцыянты, і людзі былі вымушаны ісці ў сквер Янкі Купалы.

Трэці — як было 25 лютага 1990 года. На мітынг, які адбываўся на плошчы Леніна і быў замоўлены БНФ, прыйшлі першы сакратар ЦК КПБ Сакалоў і прадстаўнікі Савета міністраў.

Самі разумееце — ступень верагоднасці гэтых варыянтаў — тайна! Але думаю, што мітынг 25 сакавіка адбудзецца ў любым выпадку.

— Цікава, а як Вы заклікаеце людзей прыйсці на плошчу? Да 25 сакавіка засталіся лічаныя дні, але, на жаль, большасць жыхароў Мінска не ведае, што канкрэтна адбудзецца ў гэты дзень і дзе адбудзецца. Няма ўлётак, якімі быў бы абклеены ўвесь горад...

— Не ведаю, чаму большасць не ведае... Раскіданы ўжо каля 400 тысяч інфармацыйных матэрыялаў і налепак, спецвыпуск газеты, ідзе хваля інфармацыі ў Інтэрнеце, незалежных СМІ. Так што значная частка людзей (прынамсі тыя, хто вызнае дэмакратычныя каштоўнасці) ведаюць. Ну а тыя, хто першапачаткова кажа: *"Я супраць усіх мітынгаў, мне на гэта напляваць"*, — нічога і слухаць не хочуць...

— Прабачце, але *"400 тысяч інфармацыйных матэрыялаў і налепак"* — гэта вельмі шмат. Яны распаўсюджваліся толькі ў рэгіёнах, ці ў Мінску таксама?

— 400 тысяч — гэта тое, што распаўсюджвалася толькі ў Мінску. А ў рэгіёнах і абласных цэнтрах — яшчэ недзе 300 тысяч.

— Пагадзіцеся, што *"400 тысяч"* у Мінску — гэта тая колькасць, якую немагчыма не заўважыць. Але нават у нашай рэдакцыі многія не бачылі тых улётак. А яны ж пры добрай арганізацыі павінны быць паўсюль: валяцца пад нагамі, вісець на кожным слупе...

— У самы бліжэйшы час будзем высвятляць, чаму гэта не так. Дапускаю, што распаўсюджвальнікі гэтую колькасць узялі, але яшчэ не раскідалі. Некаторыя, дарэчы, так і кажуць, што раскідаюць улёткі за некалькі дзён да 25 сакавіка, каб людзі не забыліся пра акцыю. Так што будзем спадзявацца, што ўсё яшчэ праявіцца...

— Зусім нядаўна "Народная воля" паведамляла пра налепкі, якія заклікаюць прадстаўнікоў улады і апазіцыі разам адсвяткаваць Дзень волі і разам выйсці на плошчу. Некаторыя адразу сказалі: маўляў, пры такім падыходзе ўвогуле не пойдзем на плошчу, бо стаяць побач з некаторымі прадстаўнікамі рэжыму — значыць, не паважаць саміх сябе...

— Лічу, што людзі нацыянальных і дэмакратычных перакананняў усё роўна прыйдуць на плошчу, каб прадэманстраваць сваю пазіцыю. А падобныя дзіцячыя заявы — на мой погляд, гэта проста недальнабачнасць і інфантыльнасць. Справа ў тым, што перамены на Беларусі без перамоў з уладай немагчымы. Калі, натуральна, разумець уладу не як аднаго канкрэтнага чалавека, а як правячую эліту, якая непасрэдна ўплывае на сітуацыю ў Беларусі. І без размовы з чыноўнікамі не адбудзецца пераменаў, бо мы не маем сілы для гэтага. Дый гэта было б контрпрадуктыўна, калі б апазіцыя мела намер павыганяць з працы некалькі тысяч чалавек, а на іх месца пасадзіць сваіх. Нават калі адзін чалавек збяжыць, то за ім тысячы чыноўнікаў не збягуць. Ім прыйдзецца працаваць...

— Значыць, Вы за тое, каб на плошчу прыйшлі і чыноўнікі, і апазіцыя?

— Так. На мой погляд, гэта нашмат лепш, чым наладжванне спадарамі Скрабцом і Фраловым 2 красавіка шэсця і мітынгу ў падтрымку нейкага яднання Беларусі і Расіі.

— Сёння асобныя грамадскія і палітычныя дзеячы кажуць пра тое, што 25 сакавіка многія апазіцыйныя лідэры будуць знаходзіцца недзе за межамі Беларусі. У адных — семінары, у другіх — важныя сустрэчы на міжнародным узроўні, у трэціх — яшчэ нешта. Як Вы да гэтага ставіцеся?

— Шэраг партый не ўдзельнічае ў аргкамітэце. І калі яны будуць адсутнічаць на плошчы 25 сакавіка, то гэта іх асабістая пазіцыя. Відаць, ім гэтая тэма проста не цікавая...

— Незалежныя аналітыкі кажуць, што некаторыя апазіцыйныя акцыі правальваліся менавіта з-за дрэннай арганізацыі. Ці ёсць у складзе аргкамітэта людзі, якія нясуць, скажам так, персанальную адказнасць за агітацыйную работу сярод рабочых МТЗ, трактарнага завода, швейных фабрык, супрацоўнікаў і студэнтаў БДУ — працуюць з людзьмі, тлумачаць ім, як важна ў гэты дзень быць разам і прыйсці на плошчу?

— Людзі з дэмакратычнымі перакананнямі сёння ёсць у кожнай сацыяльнай групе. Мы распаўсюджваем інфармацыю ў Інтэрнеце, у незалежных сродках масавай інфармацыі, і людзі, якія цікавяцца палітыкай, інфармацыю пра падзеі на плошчы маюць. Колькі ты адказных ні прызначай, немагчыма выгнаць на мітынг рабочых трактарнага завода, якія кажуць: *"А нам і так пакуль што харашо!"*. А той рабочы ці інжынер, які прызнае каштоўнасць незалежнасці і свабоды, ён сам прыйдзе на плошчу. Прыйдзе самастойна, а не ў калоне.

Марына КОКТЫШ.

ТРЭБА ВЕДАЦЬ

Рэспубліканскі лад і палітычныя свабоды ў нашай вызваленай ад імперскага ярма краіне былі выкладзеныя 9 сакавіка 1918 года 2-й Устаўной грамаце Выканаўчага камітэта Савета Першага Усебеларускага З'езда: "У межах Беларускай Народнай Рэспублікі абвяшчаецца вольнасць слова, друку, сходаў, забастовак, хаўрусаў; безумоўная вольнасць сумлення, недатыкальнасць асобы і памяшкання".

Такім чынам, якраз 9 сакавіка магло б лічыцца Днём Рэспублікі і/ці Днём волі.

Але менавіта 25 Сакавіка 1918 года была нарэшце і ўпершыню ў найноўшай гісторыі абвешчана незалежнасць Беларусі. Савет Беларускай Народнай Рэспублікі ў прынятай у Мінску 3-й Устаўной грамаце урачыста абвясціў: "Ад гэтага часу Беларуская Народная Рэспубліка абвяшчаецца незалежнай і вольнай дзяржавай".

Амаль год Савет БНР будаваў інстытуты ўлады незалежнай краіны, аднак нам не наканавана было тады пад ударамі ачмураных таталітарызмам ды хцівых суседзяў утрымаць крохкую дзяржаўнасць на даўжэйшы час.

На працягу ўсяго XX стагоддзя несавецкія беларусы ўшаноўвалі 25 Сакавіка як галоўнае беларускае свята, як Дзень Незалежнасці.

www.pbnf.by

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

Праляцеў міма Кіева. Пакуль...

У панядзелак шэраг расійскіх СМІ выйшлі з паведамленнямі, што ў Кіеў на сустрэчу з Віктарам Юшчанкам прыязджае прэзідэнт Беларусі. У Мінску журналісты наогул не маглі ні пра што даведацца, бо і сам Аляксандр Лукашэнка, і яго бліжэйшае атачэнне выхадныя праводзілі ў Сочы на гарналыжным курорце. І ўсё ж бліжэй да палудня кропкі над "і" былі расстаўлены: у сакратарыяце ўкраінскага прэзідэнта агенцтву БелаПАН паведамілі, што Лукашэнка не прыязджае ў Кіеў ні ў панядзелак, ні наогул на гэтым тыдні.

Больш за тое, дакладная дата візіту, які ўжо тры разы пераносіўся, і дасюль не вызначана.

Зазначым, што на пачатак тыдня была запланавана паездка прэзідэнта Украіны Віктара Юшчанкі ў Жытомірскую вобласць, а на 15 сакавіка — яго візіт у Данію.

І ўсё ж візіт А.Лукашэнкі ва Украіну рыхтуецца. Так, 6 сакавіка Віктар Юшчанка заяўляў: "Праз тыдзень у мяне будзе беларускі прэзідэнт".

Тым часам у Кіеве рэзка актывізавалі сваю дзейнасць прадстаўнікі беларускай апазіцыі. У аўторак тут адбылася прэс-канферэнцыя лідэраў Аб'яднанай грамадзянскай партыі Анатоля Лябедзькі і Яраслава Раманчука, яе тэма — "Восень патрыярха", і прысвечана яна была менавіта Лукашэнку. З 14 па 25 сакавіка ў Кіеве прадстаўнікі беларускай і ўкраінскай апазіцыі маюць намер правесці фестываль "Беларуская вясна", прымеркаваны да гадавіны прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі. Падчас фестывалю будзе паказаны фільм Юрыя Хашчавацкага "Плошча" і праведзена пікетаванне пасольства Беларусі ў Кіеве. 25 сакавіка, у Дзень Волі — гадавіну абвяшчэння незалежнасці БНР, у сталіцы Украіны пройдуць *"спаборніцтвы па лыжным бегу на асфальце на кубак Аляксандра Лукашэнкі, вядомага прыхільніка і папулярызатара гэтага мужнага віду спорту"*. Усе гэтыя акцыі скіраваныя на тое, каб нагадаць Віктару Юшчанку пазіцыю, якую ён агучыў пасля прэзідэнцкіх выбараў у нашай краіне: афіцыйны Кіеў поўнасцю падзяляў ацэнкі Еўрасаюза, які палічыў, што гэтыя выбары нельга было прызнаць чэснымі і дэмакратычнымі. Што ж адбылося зараз, і навошта Юшчанка пагадзіўся на сустрэчу з *"нелегітымным"* Лукашэнкам? Найбольш распаўсюджаная версія — Юшчанка выступае пасрэднікам на перамовах Еўрасаюза з беларускім лідэрам, і ягоная сустрэча з беларускім кіраўніком санкцыянавана ў Бруселі. Дарэчы, падобныя перамовы праводзілі з Леанідам Кучмам прэзідэнты Польшчы і Літвы, рыхтуючы былога прэзідэнта Украіны да таго, што яму прыйдзецца вызваліць прэзідэнцкае крэсла.

Лілія ВОРАНАВА.

РЭПАРТАЖ

Водападзел

Падобна, дэмакраты наблізіліся да таго, каб вызначыцца: хто ёсць хто?

Вільнюс. Нацыянальны камітэт Аб'яднаных дэмакратычных сіл Беларусі пры падтрымцы Савета Еўропы ў мінулыя выхадныя ладзіў тут канферэнцыю па падрыхтоўцы дакументаў, якія будуць вынесены на абмеркаванне Кангрэса дэмсіл, стратэгіі далейшых дзеянняў, нарэшце, — даты буйнога сходу. Аляксандра Мілінкевіча на сустрэчы не было. Не прыехаў, хаця шчыра абяцаў. Не прыехаў і ніводны з яго паплечнікаў: адзін, кажуць, лечыць зубы, другі — нагу, трэцяга жонка не пусціла...

Амаль тое самае адбылося напярэдадні, калі ў Мінску спрабаваў сабрацца Палітсавет дэмсіл, каб абмеркаваць набалелыя пытанні. У прызначаны час сабраліся лідэры партый і дэмакратычных рухаў, але Аляксандр Мілінкевіч не прыехаў. Не званіў, не папярэджваў... Пачалі расшукваць. Нехта з паплечнікаў былога кандыдата ў прэзідэнты паведаміў, што Мілінкевіча не будзе, бо ў яго сустрэча ў нямецкай амбасадзе. Як пазней высветлілася, сустрэча была прызначана значна пазней і па часе Мілінкевіч паспяваў на Палітсавет. Але не палічыў мэтазгодным уступіць у гаворку з паплечнікамі. (Магчыма, ужо трэба казаць былымі паплечнікамі.)

Здаецца, пра адзінства дэмакратычных сіл як галоўнае дасягненне мінулагодняй прэзідэнцкай кампаніі далей можна і не гаварыць, бо ўжо ўсім відавочна, што яго няма. І ўсё ж у Вільнюсе была прадпрынята спроба пошуку выхаду з сітуацыі, якая склалася.

Па-першае, Кангрэс вырашылі праводзіць; з Мілінкевічам ці без Мілінкевіча — гэта ўжо як ён сам і ствараемы ім рух "За свабоду!" палічыць мэтазгодным. Праўда, прыслухаўшыся да шматлікіх зваротаў, у тым ліку — Савета інтэлігенцыі, дату Кангрэса перанеслі арыенціравочна на 14—15 красавіка.

Па-другое, у цэлым адобраны праект так званай "малой Канстытуцыі" — дакумента, па якім дэмакратычныя сілы прапануюць краіне жыць у пераходны перыяд паміж дыктатурай і цывілізаванай дзяржаўнасцю. Распрацоўшчыкі праекта дакумента значна звузілі прэзідэнцкія паўнамоцтвы, прадугледзелі выбары дэпутатаў не толькі па аднамандатных акругах, але і па партыйных спісах, пашырылі паўнамоцтвы прэм'ер-міністра і органаў мясцовага самакіравання. Такі падыход быў падтрыманы: на агульную думку, народ больш не можа быць закладнікам памылак аднаго чалавека.

Па-трэцяе, як аснова зацверджана эканамічная праграма, падрыхтаваная дзвюма групамі распрацоўшчыкаў. Галоўнае ў ёй — адмова ад нематываванай прыватызацыі флагманаў беларускай прамысловасці, абяцанне эканамічных свабод для прадстаўнікоў малога і сярэдняга бізнесу (дэмакраты абяцаюць наогул вызваліць іх ад падаткаў на тры першыя гады), гарантаванне цяперашняга ўзроўню пенсій і заработных плат на перыяд рэфармавання эканомікі.

...Слухала я дакладчыкаў і марыла пра тое, як добра будзе жыць у такой Беларусі. Але надакучлівай мухай у зале круцілася пытанне: а ці прыйдуць дэмакраты да ўлады, каб рэалізаваць свае добрыя напрацоўкі; як яны збіраюцца гэта рабіць?

Пытанне наколькі неарыгінальнае, настолькі і няпростае.

Зразумела, што галоўнымі для стратэгіі перамогі з'яўляюцца тры блокі: папулярызацыя дэмакратычных ідэй і кандыдатаў сярод выбаршчыкаў, ціск на ўладу і мабілізацыя грамадства на абарону вынікаў народнага волевыяўлення. Прапановы традыцыйныя, і іншых у нашай сітуацыі не можа быць: павелічэнне тыражоў незалежных выданняў, улёткі, стварэнне спадарожнікавага тэлеканала, змены ў Выбарчае заканадаўства... Але ў людзей, якія не так даўно акунуліся ў палітычны вір і ў якіх яшчэ не так зашораныя вочы, ёсць цікавыя назіранні, якія даюць падставу як мінімум задумацца, а як максімум — зрабіць высновы, чаму дэмакраты аніяк не могуць перамагчы, а толькі церпяць паразу за паразай. Віктар Гарбачоў, лідэр прадпрымальнікаў з Барысава, параіў прысутным задумацца над пытаннем, пад чым кіраўніцтвам ідзе падрыхтоўка да святкавання Дня волі 25 сакавіка. Віктар буйнымі літарамі намаляваў "25" і стрэлачкамі вызначаў тых, хто з-за розных мерапрыемстваў абміне Мінск у гэты дзень і аніяк не зможа ўзяць удзел у акцыі пратэсту.

З 23 па 26 сакавіка адзін з фондаў, што працуе ў Беларусі, вывозіць у Літву групу дэмакратычных дэпутатаў, якія нядаўна былі абраны ў мясцовыя Саветы. Прыблізна 30 чалавек.

З 24 па 26 сакавіка ладзіцца семінар па гендэрнай палітыцы, на якім, зразумела, будуць прысутнічаць найбольш актыўныя жанчыны. Ён будзе праходзіць за межамі Мінска, колькасць — як найболей.

З 22 па 28 сакавіка група моладзі па 50 чалавек выязджаюць у Кіеў і Варшаву, каб там праводзіць мерапрыемствы да беларускага Дня волі.

З 22 па 31 сакавіка ў Германію выязджаюць 40 найбольш актыўных прадстаўнікоў інтэлігенцыі на семінары па грамадзянскай адукацыі.

Менавіта на 25 сакавіка розныя недзяржаўныя аб'яднанні прызначылі аднадзённыя выезды на нейкія важныя вучобы па важных і актуальных тэмах.

Ці выпадкова ўсё гэта? Ці выпадкова найбольш актыўную частку дэмакратычнага руху проста звозяць з Мінска, каб не былі гэтыя людзі на плошчы, каб і самі не ўдзельнічалі ў акцыі, і сяброў не прывялі? Ці выпадкова агітацыйныя матэрыялы (налепкі, улёткі і г.д.) былі раздадзены "ў рэгіёны", хаця акцыя будзе праходзіць у Мінску? І наогул, ці выпадкова для сустрэч з грамадскасцю дэмакратычныя лідэры ладзяць маршруты па глыбінцы і маленькіх гарадах, проста абмінаючы Мінск, хаця ўсім зразумела, што галоўныя палітычныя пытанні вырашае менавіта сталіца?..

Амаль ніколі яшчэ так адкрыта не ставілася пытанне аб дзейнасці спецслужб у дэмакратычным асяродку. Выступленне Віктара Гарбачова прысутныя сустрэлі апладысментамі. І калі сапраўды будуць зроблены высновы, то, на мой погляд, гэта стане галоўным вынікам канферэнцыі ў Вільнюсе. Бо не можа быць выпадковасцю такая колькасць глупства, якое мы назіраем у дзеяннях нават вельмі вядомых дэмакратаў.

Алена НОВІКАВА.

ДАРЭЧЫ

У Сочы Аляксандр Лукашэнка будзе катацца на лыжах да пятніцы. Разам з ім у Расіі бавіць час прадстаўнічая дэлегацыя прыкладна з пяцідзесяці чалавек, якая складаецца з вядомых беларускіх спартсменаў, артыстаў і чыноўнікаў ад спорту. Афіцыйных паведамленняў пра тое, што кіраўнік дзяржавы афіцыйна пайшоў у адпачынак, не было.

Народная Воля http://www.nv-online.info
16 САКАВІКА 2007 г.

ПРОТЕСТ

Запланированное Александром Лукашенко строительство Ледового дворца в Солигорске вызвало неожиданное для властей противостояние горожан

В Солигорске, не исключено, состоится референдум. В состав инициативной группы из 58 человек вошли индивидуальные предприниматели рынка "Старовокзальный" и активисты демократических организаций. Группа уже подала документы на регистрацию в райисполком. На рассмотрение жителей региона предлагается два вопроса: "Согласны ли вы на строительство Ледового дворца на месте рынка "Старовокзальный"? Считаете ли вы целесообразным, чтобы строительство Ледового дворца осуществлялось в основном за счет местного бюджета?"

О людях не думают, деньги не считают

Индивидуальные предприниматели рынка "Старовокзальный", согласно распоряжению исполкома, должны 1 апреля перебраться из центра города на окраину, на практически готовую автостоянку частных владельцев фирмы "Радуга-Свет".

— Да нам буквально навязали этот рынок, — рассказывала представительница администрации этой фирмы. — Приказали на заседании исполкома: "Забирайте рынок, потому что на его месте надо строить дворец". Пришлось второпях переоборудовать автостоянку. Конечно, стоянка была бы для нас выгоднее, но как отказаться? Мы не можем ссориться с властями, поэтому вы пишите без фамилий...

Однако предприниматели рынка "Старовокзальный" решили не уступать. Рассудили так: для Ледового дворца можно было подыскать и другое место, если уж он так необходим. У них свой резон: на краю города, куда выселяют рынок, выручка будет далеко не та. Для многих это прямая дорога к разорению, придется расставаться с продавцами — те останутся без работы... Да и вообще, нужен ли дворец? Почему власти не спросили у местных жителей мнения на сей счет?

— Мы опросили более тысячи покупателей. Все за то, чтобы рынок "Старовокзальный" остался на этом месте, — говорит предпринимательница Людмила Пушко, член инициативной группы по проведению референдума. — Муниципальный рынок давал ежемесячно 52 процента прибыли; прибыльной, несомненно, была бы и автостоянка. Разве можно назвать рачительным подход, когда вместо двух предприятий, дающих немалые деньги в казну, оставляют одно, при этом делая его менее рентабельным?

А если еще учесть, что две трети затрат на строительство дворца планируется взвалить на плечи города, то уже не только место строительства, но и целесообразность строительства вызывает у многих солигорчан удивление. А когда начинаешь разбираться в проблеме глубже — даже возмущение. Например, под площадкой рынка "Старовокзальный" проходит узел коммуникаций городского хозяйства, перенос его в другое место обойдется в многие сотни тысяч долларов. Понимая это, солигорские архитекторы предлагали строить дворец (коль так уж захотелось президенту) в другом месте: на свободной площадке, где надо было сделать всего лишь небольшой отвод, чтобы подключиться к коммуникациям. Но кому-то идея не понравилась. Вероятно, кому-то из тех, кто на народные деньги смотрит свысока.

Ради дворца власть ввела для всех обязательные субботники

На строительство Ледового дворца местному бюджету придется отстегнуть более 15 миллиардов рублей (без учета замены коммуникаций). Денег таких нет и близко. Председатель районного Совета депутатов Лидия Клишевич предложила *"строить дворец гуртом"*. Слова свои главный депутат Солигорщины озвучила на расширенном заседании местных народных избранников, куда также сошлись и съехались ответственные работники Солигорского горисполкома, представители облисполкома, а также депутат Палаты представителей от региона Калугин и член Совета Республики Миронова. Председатель Солигорского райисполкома Александр Римашевский рассказал, что определенная важная работа по "строительству гуртом" уже проведена. Райисполком распорядился о ежемесячных субботниках на предприятиях и учреждениях с перечислением денежных средств на спецсчет, рассчитывают также на деньги самих предприятий. РУП "ПО "Беларуськалий" уже выделил три миллиарда рублей, идет активный нажим и на сознательность предпринимателей. Вспомнил глава солигорской вертикали и о том, как "жали" на собственников автостоянки — Зайцева и Юрченко: "Ради дворца мы заставили их перепрофилировать автостоянку в рынок".

Про то, что город буквально задыхается от нехватки автостоянок, детям во дворах из-за машин ни попрыгать, ни побегать, вертикаль и депутаты не вспомнили.

Не проинформировали руководители города депутатов и о том, что в Солигорске назревает референдум, а ведь документы на регистрацию инициативной группы уже были сданы в исполком. Может, решили, что это несерьезно? Или для депутатов это не имеет значения?

Сколько можно обдирать?

В Солигорске в общей очереди на получение жилья томятся 7 тысяч 400 человек, в больнице не хватает современного оборудования, необходим новый роддом, из-за нехватки мест трудно попасть в общественную баню. Много других нерешенных социальных вопросов. Строительство Ледового дворца законсервирует их решение на неопределенное время. Солигорчане это понимают. А потому идея референдума становится все более популярной.

— Делают, что хотят. Сколько можно плевать на интересы людей? — говорит член инициативной группы Татьяна Кучинская. — Все мои знакомые — за референдум. Боятся, правда, открыто высказываться, на работе (из-за контрактов) помалкивают, но помогать обещали.

Брожение, действительно, по большей части пока глухое. Но все чаще ищут жители контакты с инициативной группой, приносят им информацию типа: директор предприятия N недоволен позицией исполкома в отношении проведения субботников, возражает. Правда, тут же вздыхают: дожмут, наверное.

А вот еще примеры высказываний, которые слышала автор этих строк.

— Зачем нам этот дворец? Хорошо, если я деньги только на один конек найду, — говорит уборщица ЖКХ Татьяна. — Нам осенью зарплату на 50 тысяч урезали, а теперь еще заставляют бесплатно на этот дворец пахать. Лучше бы дороги в порядок привели. На каблуках пройти невозможно.

— У меня друг в инициативной группе, — говорит сварщик Алексей. — Нет, он не предприниматель. Рабочий. А я не осмелился и уже жалею об этом. То, что предлагают ребята, — это смело и справедливо. В цеху у нас все гудят: в конце концов, до каких пор нас будут обдирать, даже не спрашивая согласия? Так что какой-то перелом в сознании людей назревает, референдум поддержим.

Тамара работает в РУП "ПО "Беларуськалий".

— Дочь моя в женскую партию "Надзея" вступила. Говорит, что в инициативной группе много женщин из этой партии. Я тоже хочу вступить. Референдум нужен, только бы власти чего-нибудь не придумали.

Кстати, две трети членов инициативной группы — женщины. Действительно, многие из них — из Белорусской партии женщин "Надзея". Эти женщины, как и мужчины из инициативной группы, из тех, кто научился не терять оптимизма даже в наших условиях. Стало быть, идее референдума уже придан хороший энергетический импульс.

Лариса НАСАНОВИЧ.

Солигорск.

ПАЛІТКУХНЯ

Палітсавету падшукалі замену

Улада ўнутры Аб'яднаных дэмакратычных сіл (АДС) ад Палітычнага савета на чале з Аляксандрам Мілінкевічам можа перайсці да аргкамітэта па падрыхтоўцы Кангрэса дэмакратычных сіл (КДС), які ўзначальвае Аляксандр Бухвостаў. Такі варыянт усур'ёз разглядаецца кіраўніцтвам АДС.

Палітычны савет не можа болей выконваць каардынуючую ролю ўнутры дэмакратычных сіл, а таму ягоныя паўнамоцтвы і функцыі мусяць перайсці ў рукі аргкамітэта па падрыхтоўцы і правядзенні Кангрэса. Такі лейтматыў выступленняў на апошнім пасяджэнні Палітсавета. Справа ў тым, што рашэнні Палітсавет прымае дзвюма трацямі галасоў, але склаліся такія блокі (Аляксандр Мілінкевіч, аргкамітэты па стварэнні БСДП (Народная Грамада) Міколы Статкевіча, Партыі свабоды і прагрэсу Уладзіміра Навасяда, незарэгістраваная арганізацыя "Малады Фронт" і БСДГ Станіслава Шушкевіча), якія блакіруюць працу органа. У выніку з 12 суб'ектаў — сябраў Палітсавета пяць "тарпедзіруюць Кангрэс", як выказаўся старшыня аргкамітэта па правядзенні КДС Аляксандр Бухвостаў.

На апошнім пасяджэнні якраз-такі адсутнічалі названыя палітычныя сілы, таму кворуму пасяджэнне не мела. Паўтарэнне падобнай сітуацыі вымусіла Палітсавет на поўным сур'ёзе ўзняць пытанне пра прыпыненне дзейнасці і нават пра самароспуск. Пакуль канчатковае вырашэнне пытання адкладзена. Але толькі да 15 сакавіка. Пагадняльная камісія мусіць канчаткова дапрацаваць усе прапановы па "Кампрамісе дзеля адзінства" Вінцука Вячоркі, з тым каб 15 сакавіка прыняць гэтыя дакументы. І працаваць, а не працягваць пустое высвятленне адносінаў паміж сабой. Калі не — дык Палітсавет проста самараспусціцца.

Глеб ХМЯЛЬНІЦКІ.

СТАЛІЦА

Цэны ашалелі

У лютым 2007 года на другасным рынку жылля Мінска (не ў новабудоўлях) цэны выраслі на 12,9%. Пра гэта паведамляе інтэрнет-цэнтр нерухомасці Realt.by. За люты сярэдняя цана за квадратны метр у Мінску вырасла на 174 долары — да ўзроўню 1519 долараў.

Хутчэй за ўсё цэны павышаліся на адна- і трохпакаёвыя кватэры. Яны падаражэлі на 14% і 15,4% адпаведна. Двух- і чатырохпакаёвыя — на 10,5% і 12% адпаведна. Лідэрамі па велічыні сярэдніх цэн на прапановы кватэр па-ранейшаму з'яўляюцца Цэнтральны (1854 долары за кв. м) і Савецкі (1707) раёны. Самыя нізкія цэны ў Заводскім (1436) і Ленінскім (1494) раёнах. Цэны ў іншых раёнах сталіцы вагаюцца на ўзроўні 1560 долараў за кв. м.

Кватэры ў новабудоўлях прапануюцца па камерцыйных цэнах ад 1000 да 1700 долараў за квадратны метр. Сярэдняя цана прапановы долевага будаўніцтва кватэр у Мінску складае 1450 долараў/кв.м.

Ну і як набыць кватэру па такіх цэнах?

Марына НОСАВА.

ПОЛИТКУХНЯ

Сколько стоит дружба Лу и Зю?

Дохлятиной воняет из Москвы... Помните: с этих лукашенковских слов белорусское телевидение не так давно начало репортаж о встрече белорусского правителя с его идеологическим братом Геннадием Зюгановым. Вслед за этим последовало еще несколько горстей пороха в дымящийся энергетический конфликт. Кажется, Владимира Путина еще никто не сравнивал с "бухгалтером захудалого колхоза". Перец ситуации, однако, не в оскорбительной риторике, давно уже ставшей визитной карточкой главного белорусского начальника. Впервые за время энергетического противостояния Лукашенко обратил критику не на олигархов и "Газпром", а лично на российского президента. Что за этим стоит в действительности?

Лукашенко проиграл энергетический раунд. И хоть Кремль не стал посылать белорусского правителя в нокаут, проигрыш очевиден. Это прослеживается и в настроениях в обществе, и в кулуарной риторике управленческой "вертикали".

Большинство обитателей Кремля полагает, что дожимать Лукашенко — значит подогревать революционную ситуацию в Беларуси. А на революции в Москве еще большая аллергия, чем на белорусского правителя. Это секрет полишинеля. Лукашенко понимает, что для России он хоть и "сукин сын", но в ближайшей перспективе незаменимый "сукин сын". Поэтому никакого белого полотенца, выброшенного на ринг. Наоборот, воинственность и риторика в духе *"мы вам покажем кузькину мать"*. Задача-минимум — погасить упаднические настроения в стране и продемонстрировать, что Лукашенко не хромая утка, а важный политический фактор, и не только в Беларуси, но и в Европе. Свой конфуз белорусский правитель пытается компенсировать петушиными наскоками, жесткой риторикой и намеками на готовность во внешней политике "лететь на двух крыльях". Но Лукашенко не собирается ограничиваться только словесной теледуэлью.

Есть основания полагать, что решение перенести действия в тыл врага, за линию Третьего Белорусского фронта, принято. Лучшая защита — это нападение. И здесь стоит выделить несколько направлений. Первое — информационно-пропагандистская работа в России. "Круглый стол", организованный в "Аргументах и фактах", — это лишь первая ласточка, за которой последуют новые инициативы. Режим нуждается в поддержке (или хотя бы ее видимости) части российской элиты. Из Москвы должны звучать голоса солидарности с Лукашенко как единственным союзником России. Равно как и должны озвучиваться данные социологических опросов, фиксирующие симпатии простых россиян к белорусскому экономическому чуду и его архитектору. Все это требует времени и самое главное — денег. Но это не тот случай, когда надо жалеть. Есть информация, что некий Мусиенко является куратором этого направления. Впрочем, почему некий? Именно его конторе под названием "Ecoom" было предоставлено право озвучивать данные социологических опросов в преддверии и сразу после завершения голосования на последнем референдуме.

На кого может рассчитывать белорусский "Красный дом" в России? На тех, кто болеет ностальгией по прошлому, кто жаждет помыть сапоги в Индийском океане, кого тошнит от демократии. Таковых немало. Лукашенко позиционирует себя как лидер сил реванша на всем постсоветском пространстве. Сегодня немногие действующие политики в России позволяют себе критиковать лично Путина. В ситуации "хочу, но не могу" многим симпатична роль крутого ковбоя из-под Шклова, которую играет белорусский правитель. Он-то и хочет, и может.

Другое направление — влияние на политические процессы, происходящие в самой России. Такая стратегия объясняет появление в Минске одного из лидеров европейских левых. Причем это уже второй визит венгерского коммуниста Дьюла Тюрмера за последних два месяца. И он неслучайно совпал с приездом в Минск лидера КПРФ Геннадия Зюганова. За минской тусовкой явно просматриваются очертания парламентских и президентских выборов в России. В свете сегодняшних отношений "Красного дома" и Кремля исход выборов носит для белорусского начальника громадное значение. Темперамент не позволяет Лукашенко быть сторонним наблюдателем. Можно предположить, о чем говорили с глазу на глаз два соратника. Есть ощущение, что беседа не завершилась на уровне заявлений "Мы будем за тебя молиться, Гена". Белорусские инвестиции в Геннадия Андреевича — это на самом деле не благотворительность, а вложения в собственную политическую безопасность местного правителя. Это небезопасный проект, но Лукашенко скорее всего будет рисковать. Выбор у него невелик. Неудивительно, что после встречи с Лукашенко лидер КПРФ особенно напирал, что *"смена власти в России неизбежна"*.

В белорусских условиях, когда отсутствует общественный контроль над государственными средствами, когда министр финансов публично заявляет, что денег от продажи оружия в бюджете нет, выделить десяток-другой миллионов долларов на братскую помощь проблемой не является. Если этого не делать, то и товарищ Зю покажет спину.

Анатолий ЛЕБЕДЬКО.

АКЦЫЯ

Яны таксама хацелі свабоды…

29 сакавіка ў 17.00 у трох месцах Мінска запланавана правядзенне сімвалічных акцый памінання бязвінна загінуўшых ахвяр сталінізму. Такое рашэнне прынята на чарговым пасяджэнні грамадскага аргкамітэта па ўвекавечанні памяці ахвяр рэпрэсій перыяду сталінізму па прапанове сакратара аргкамітэта Уладзіміра Раманоўскага.

Плануецца правядзенне акцый ва ўрочышчы Курапаты, парку Чэлюскінцаў і на ўскраіне мікраараёна "Лошыца". Паводле слоў У.Раманоўскага, на працягу гэтага тыдня неабходна завяршыць стварэнне абласных аргкамітэтаў і складанне спісу месцаў масавых расстрэлаў ахвяр сталінізму 1920—1940-х гадоў на тэрыторыі Беларусі па матэрыялах даследаванняў вучоных і інфармацыі з месцаў.

Як паведаміў даследчык тэмы сталінскіх рэпрэсій кандыдат гістарычных навук Ігар Кузняцоў, ужо сабрана больш за 200 тысяч рублёў ахвяраванняў на ўвекавечанне памяці бязвінна загінуўшых людзей. Удзельнікі пасяджэння падтрымалі прапановы вучонага аб накіраванні ў рэгіёны падпісных лістоў па зборы ахвяраванняў і завяршэнні гэтай акцыі да 1 ліпеня, а таксама аб звароце да кіраўнікоў грамадскіх арганізацый, партый і рухаў узяць удзел у акцыі 29 сакавіка.

Марат ГАРАВЫ.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

Чыноўнікі адкажуць за самаўпраўства

Беспрэцэдэнтны выпадак: ГУУС Жодзіна (Мінская вобласць) узбудзіла крымінальную справу супраць мясцовых чыноўнікаў за перашкоды прадпрымальніцкай дзейнасці.

Індывідуальны прадпрымальнік з Жодзіна Мікалай Горбач чатыры гады ваюе з мясцовай вертыкаллю за права працаваць вадзіцелем маршрутнага таксі. Апошнім працоўным годам для прадпрымальніка стаў 2005-ы, пасля якога мясцовыя "Аўтапарк №18" і Жодзінскі гарвыканкам не працягнулі з ІП дамову на права займацца перавозкай людзей. Датуль гады тры прадпрымальнік змагаўся супраць самаўпраўства жодзінскіх чыноўнікаў.

Мікалай Горбач яшчэ 5 снежня 2006 года звярнуўся ў ГУУС Жодзіна і пракуратуру горада са скаргай на незаконныя дзеянні выканкама і "Аўтапарка №18", угледзеўшы ў дзеяннях службовых асоб прыкметы злачынстваў, прадугледжаных артыкуламі 232 (перашкоды прадпрымальніцкай дзейнасці) і 426 (злоўжыванне службовым становішчам) Крымінальнага кодэкса.

"Злоўжываючы службовым становішчам, з прычыны асабістых непрыязных адносін, што ўзніклі з-за занятай мною прынцыповай і крытычнай пазіцыі ў адносінах да арганізацыі перавозак маршрутнымі таксі, а затым, падчас правядзення конкурсу па размеркаванні маршрутаў, якія яны правялі з парушэннем заканадаўства, чыняць перашкоды мне на працягу доўгага часу ажыццяўляць прадпрымальніцкую дзейнасць, а менавіта: нематывавана адмаўляюць мне ў працягненні ці заключэнні дамовы на перавозку пасажыраў па маршруце №5, права на які я выйграў у выніку конкурсу, праведзенага ў 2004 годзе", — напісаў М.Горбач.

5 сакавіка ГУУС Жодзіна ўзбудзіла крымінальную справу па артыкуле 232 "Перашкоды прадпрымальніцкай дзейнасці" супраць дырэктара "Аўтапарка №18" Ірыны Саладухі і яе былога намесніка Сяргея Бялова.

Спецыяльнае расследаванне гэтай гісторыі "Народнай воляй" чытайце ў наступных нумарах.

Глеб ХМЯЛЬНІЦКІ.

ЕЎРАБАЧАННЕ-2007

Калдун задаволены

У паўфінале міжнароднага конкурсу песні "Еўрабачанне-2007" у Хельсінкі беларускі спявак Дзмітрый Калдун выступіць пад чацвёртым нумарам. Такі вынік жараб'ёўкі, што прайшла 12 сакавіка.

Перад Калдуном на сцэну выйдуць прадстаўнікі Балгарыі, Ізраіля і Кіпра. Усяго ў конкурсе ўдзельнічаюць прадстаўнікі 42 краін. 28 з іх пачнуць барацьбу за перамогу з паўфіналу, астатнія выступяць адразу ў фінале. Афіцыйны сайт "Еўрабачання" дае каментар Калдуна пасля жараб'ёўкі: *"У мяне цудоўная пазіцыя ў спісе паўфіналістаў. Шчыра кажучы, для мяне гэта не прынцыпова. Я зраблю ўсё, што ад мяне залежыць"*.

Паўфінал пройдзе 10 мая, фінал — 12 мая. Калдун выканае песню "Work your magic" (музыка Філіпа Кіркорава, тэкст Карэна Кавалерана).

Дзмітрый УЛАСАЎ.

Народная Воля http://www.nv-online.info
16 САКАВІКА 2007 г.

Грамадскасць патрабуе вызвалення Дзяніса Дзянісава

Маладзёжныя актывісты перадалі ў пасольствы дзевяці краін, што размешчаны ў Мінску, зварот з заклікам "прыняць адпаведныя меры, што прывядуць да вызвалення палітзняволеных", у тым ліку члена Аб'яднанай грамадзянскай партыі Дзяніса Дзянісава.

Нагадаем, член АГП Д.Дзянісаў быў затрыманы 16 лютага і цяпер знаходзіцца ў віцебскім следчым ізалятары № 2. Яго абвінавачваюць ва ўчыненні злачынства, прадугледжанага артыкулам 342 Крымінальнага кодэкса (арганізацыя групавых дзеянняў, што груба парушаюць грамадскі парадак). Прадугледжанае пакаранне — да трох гадоў пазбаўлення волі.

Арышт Дзянісава абмяркоўваўся і ў ходзе сустрэчы з прадстаўнікамі вярхоўнага камісара Еўрасаюза па знешняй палітыцы і бяспецы Хаўера Саланы.

Лідэр Партыі камуністаў Беларускай (ПКБ) Сяргей Калякін і старшыня АГП Анатоль Лябедзька падкрэслілі, што ніякага дыялогу з беларускімі ўладамі без удзелу аб'яднаных дэмакратычных сіл быць не можа.

Было таксама зазначана, што абавязковай умовай дыялогу ЕС з беларускімі ўладамі павінна стаць абмеркаванне пытання "аб палітычных зняволеных у краіне і іх тэрміновым вызваленні", абмеркаванне выбарчага заканадаўства Беларусі і практыкі яго прымянення, а таксама магчымасць доступу апанентаў улады да дзяржаўных СМІ і нармальныя ўмовы для развіцця партый, грамадскіх аб'яднанняў і незалежнай прэсы.

Таццяна КАРАВЯНКОВА.

Дашкевіч можа быць пазбаўлены права на амністыю

Адміністрацыя шклоўскай калоніі № 17, дзе адбывае пакаранне маладзёжны актывіст Дзмітрый Дашкевіч, вынесла маладому чалавеку чацвёртае папярэджанне. Гэта азначае, што Д.Дашкевіч можа быць пазбаўлены права на амністыю.

Пра гэта БелаПАН паведаміў таварыш Д.Дашкевіча Барыс Гарэцкі, які 11 сакавіка атрымаў ліст ад Дзмітрыя. *"Піша, што папярэджанне яму было вынесена за тое, што ён чытаў пасля адбою. Папярэджанне ўжо чацвёртае па ліку, таму, як напісаў Дашкевіч, ён лічыцца злосным парушальнікам рэжыму, які не стаў на шлях выпраўлення. Ён напісаў, што "на амністыю можна не спадзявацца",* — распавёў Б.Гарэцкі.

Апрача таго, паводле слоў Б.Гарэцкага, такая колькасць папярэджанняў пазбаўляе Д.Дашкевіча права на наведванне яго сваякамі.

Нагадаем, 1 лістапада 2006 года суд Кастрычніцкага раёна Мінска прызнаў Д.Дашкевіча вінаватым у дзейнасці ад імя незарэгістраванай арганізацыі "Малады фронт" (артыкул 193-1 Крымінальнага кодэкса) і прызначыў яму пакаранне ў выглядзе аднаго года і шасці месяцаў пазбаўлення волі ў калоніі агульнага рэжыму. Працэс праходзіў у закрытым рэжыме. 7 снежня Д.Дашкевіча перавялі з мінскага следчага ізалятара ў калонію ў Шклове (Магілёўская вобласць)

.

Сяргей ПУЛЬША.

ВАС ЦІКАВІЦЬ...

У свой час шырока рэкламавалася Дзяржаўная праграма адраджэння і развіцця вёскі на 2005—2010 гады. Цікава, колькі ж грошай было выдзелена для рэалізацыі гэтай праграмы ў 2006 годзе?

Зоя МАРАЧКІНА, служачая.

Больш за 14 трыльёнаў рублёў!

Спадарыня Марачкіна!

"Народнай волі" няцяжка адказаць на Ваша пытанне, паколькі мы маем афіцыйны дакумент, у якім утрымліваюцца ўсе неабходныя лічбы. Заўважым, што на рэалізацыю Дзяржаўнай праграмы адраджэння і развіцця вёскі з усіх крыніц фінансавання ў мінулым годзе прадугледжвалася выдзеліць 11,8 трыльёна рублёў, у тым ліку: за кошт бюджэту — 4,9 трыльёна рублёў; уласных сродкаў — 4,8 трыльёна рублёў; крэдытаў банкаў — 1,9 трыльёна рублёў; сродкаў інвестараў — 157,8 мільярда рублёў.

У рэальнасці лічбы па некаторых пазіцыях пераўзышлі тыя, якія планаваліся. Усяго на рэалізацыю Праграмы з усіх крыніц фінансавання было накіравана больш за 14 трыльёнаў рублёў.

Застаецца адна загадка: ці эфектыўна выкарыстаны гэтыя велізарныя сродкі? І колькі ж іх яшчэ спатрэбіцца, каб сапраўды адрадзіць паміраючую вёску?

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

Аляксандр МІЛІНКЕВІЧ:

«Крызіс дэмакратычнага руху пачаўся адразу ж пасля выбараў»

19 сакавіка будзе роўна год, як прайшлі выбары прэзідэнта. Адзін з экс-кандыдатаў Аляксандр Казулін зараз у турме, з другім, ***Аляксандрам МІЛІНКЕВІЧАМ****, гутарыць карэспандэнт "Народнай волі"*

— Аляксандр Уладзіміравіч, праз год пасля выбараў даводзіцца канстатаваць, што дэмакратычны рух раскалоўся на некалькі частак...

— Я думаю, што ў беларускім дэмакратычным руху ёсць крызіс, і гэта зусім відавочна. Мы не выкарысталі цалкам увесь патэнцыял, які быў напрацаваны ў час кампаніі і выліўся ў акцыі пратэсту пасля 19 сакавіка. Гэта наш вялікі недахоп у працы, бо мы зацыкліліся на разборках паміж лідэрамі і практычна мала займаліся новымі людзьмі. А іх было шмат. Трэба выкарыстоўваць патэнцыял нашых людзей, арганізоўваць дзейнасць. Арганізуем дзейнасць — нармальна, будзем увесь час сядзець за "круглымі сталамі" — згубім настрой у грамадстве.

— Калі, на Ваш погляд, пачаўся крызіс?

— Я думаю, што адразу пасля выбараў, бо існавалі два альтэрнатыўныя падыходы да аднаго і таго ж пытання. Першы — працуем далей разам, другі — працуем кожны на сваю арганізацыю, але час ад часу робім супольныя акцыі. Я — за першы, таму што заўсёды выступаў за аб'яднанне ўсіх сіл, якія ёсць, — і партыйных, і беспартыйных. Толькі ў гэтым я бачу залог перамогі — іншага варыянту няма.

— Тым не менш адразу пасля выбараў знешне не было бачна, што ў дэмакратычным руху ўжо пачаўся раскол...

— Я і не кажу, што гэта адразу ж кідалася ў вочы. Аднак калі ў маі мінулага года мы паехалі падводзіць вынікі кампаніі па ўсіх абласцях, то ўжо на той момант было ўсё відавочна — са мной адправіўся толькі Вінцук Вячорка. Адзінда візіты зрабілі другія лідэры партый, але камандай мы ўжо больш не ездзілі. Нават вынікаў як след не падвялі. І, я лічу, што гэта быў першы сімптом расколу дэмакратычнага руху.

— Ці бачыце Вы нейкія вынікі сваёй працы за гэты год?

— Я для сябе лічу, што год быў плённы, але шкадую аб тым, што спрабаваў арганізаваць шырокі рух праз Палітычны савет. Гэта аказалася немагчымым, таму што і сам Палітсавет не аб'яднаны. Аднак я не згубіў кантакт з лідэрамі партый, і гэта таксама важна.

— Калі б 19 сакавіка гэтага года зноў праводзіліся выбары, якую колькасць галасоў Вы набралі б зараз?

— Ёсць жа незалежная сацыялогія, якая паказвае, што пасля выбараў ва ўсіх рэйтынг зніжаецца, хоць у мяне, я лічу, застаецца дастаткова высокім — сёння за мяне гатовы галасаваць 11—12 працэнтаў. Калі ўспомніць 2001 год, праз год пра кандыдатаў у прэзідэнты ўжо мала хто помніў, і іх рэйтынг знізіўся да ўзроўню статыстычнай памылкі.

— А што кажуць сацыёлагі аб рэйтынгу Аляксандра Казуліна, які зараз у турме?

— Яго рэйтынг па гэтых жа звестках — каля 5 працэнтаў. Крыху таксама знізіўся, але гэта нармальна. Кажуць, што пасля выбараў палярызацыя знікае і ва ўсіх кандыдатаў абавязкова падаюць лічбы.

— У апошні час гучаць прапановы, каб на Кангрэсе адзіным кандыдатам аб'яднанага дэмакратычнага руху быў абраны Аляксандр Казулін, якому зараз вельмі неабходна маральная падтрымка. Як Вы да гэтага ставіцеся?

— Мае адносіны да Кангрэса шмат разоў агучаны, і я іх не мяняю. Я лічу, што трэба працаваць супольна з адным штабам і з адным лідэрам, і Кангрэс павінен вырашаць, хто для яго сёння найбольш эфектыўны лідэр, каго лягчэй раскручваць, з кім лягчэй ісці. Аляксандр Казулін, безумоўна, вельмі годны чалавек, якому патрэбна маральная падтрымка. І, калі казаць, што вынікам Кангрэса павінна стаць маральная падтрымка Казуліна — гэта адно. Калі казаць пра эфектыўнасць супольнай працы на карысць дэмакратычных каштоўнасцяў — гэта можа быць іншае. Я б не супрацьпастаўляў адно аднаму. Проста хачу, каб гэта быў перш за ўсё легітымны Кангрэс. Па-другое, з шырокім прадстаўніцтвам. І трэцяе — адзіны лідэр павінен быць вызначаны тайным галасаваннем.

— А ці магчымы ў прынцыпе дыялог з уладамі?

— Ведаеце, я, з аднаго боку, прагматык і бачу, што сёння ўлада паказвае сваю непадрыхтаванасць да дыялогу. Але калі прапануеш дыялог, то ты выйграеш. У першую чаргу — маральна. І мой зварот да Аляксандра Лукашэнкі — гэта ж не толькі да яго, але і да грамадскасці, да міжнароднай супольнасці, да людзей, якія ва ўладзе. Праўда, адказу мне да гэтага часу ніякага няма.

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

БЛІЦ

Дык што ж будзе 25 сакавіка?

Некалькі тыдняў таму карэспандэнт "Народнай волі" выйшаў на вуліцы сталіцы і пытаўся ў мінакоў: "Ці ведаеце Вы, што адбудзецца 25 сакавіка?"

Сёння гэтае ж пытанне мы вырашылі задаць прадстаўнікам апазіцыі і супрацоўнікам дзяржаўных структур.

Анатоль ЛЯЎКОВІЧ, выконваючы абавязкі старшыні Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада):

— 25 сакавіка — знакавая дата ў гісторыі нашай краіны. На сённяшні дзень гэтая дата — мост паміж мінулым і будучым. Наша задача — абазначыць гэта. Што канкрэтна адбудзецца ў гэты дзень, я не ведаю — гэтым займаецца аргкамітэт, у дэталі я пакуль не удаваўся. Мяне засмучае тое, што сярод апазіцыі дагэтуль няма згоды наконт таго, як святкаваць гэтую дату. Гэта звязана з тым, што зараз унутры апазіцыі існуе крызіс, які неабходна пераадолець. Дарэчы, мне апошнім часам не вельмі падабаецца, як сябе паводзіць той жа Аляксандр Мілінкевіч. Мне здаецца, ён праводзіць не сваю палітыку, а нечыя загады. Ён падзяляў нашыя погляды, казаў, што Лукашэнка не зрабіў ніводнага кроку насустрач нам, Лукашэнка не выканаў патрабаванні, якія вылучыў Еўрасаюз... І тут жа Мілінкевіч піша адкрыты ліст дыктатару... Дзе логіка?

Віктар КАРНЯЕНКА, адзін са стваральнікаў незарэгістраванага руху "За свабоду!":

— Я спадзяюся, што гэты дзень сапраўды стане святочным. Я спадзяюся, што менавіта ад 25 сакавіка распачнецца дыялог паміж дэмакратычнымі сіламі і прадстаўнікамі ўлады. Я спадзяюся, што ў гэты дзень не будзе разгону. Бо 25 сакавіка пройдзе мірная дэманстрацыя.

Аляксандр Мілінкевіч сказаў, што ягоны ліст, накіраваны Аляксандру Лукашэнку, атрымаў добразычлівую рэакцыю ў прадстаўнікоў улады. Гэта сапраўды так. Праўда, канкрэтныя прозвішчы людзей з уладных структур называць, я думаю, не варта. Па крайняй меры, гэта справа самога Мілінкевіча. Але я спадзяюся, што сёлета 25 сакавіка стане вызначальным днём.

СУПРАЦОЎНІК прэс-службы Аляксандра Лукашэнкі, (сябе назваць адмовіўся):

— Паўла Мікалаевіча (Павел Лёгкі — кіраўнік прэс-службы А.Лукашэнкі. — **Аўт.**) няма на месцы. Але пытанне, якое вы задаяце, адносіцца не да нашай кампетэнцыі. Мы займаемся крыху іншымі пытаннямі. Увогуле, нічога пісаць не варта. Да пабачэння...

Святлана ШЫЦІНАВА, супрацоўніца прэс-службы Мінгарвыканкама:

— Мне нічога не вядома. Мітынгамі ў нас займаецца ўпраўленне ідэалагічнай працы. Тэлефануйце туды. (Тэлефон, які нам назвалі, упарта не адказваў. — **Аўт.**)

Юрась БЕЛЕНЬКІ, выконваючы абавязкі старшыні Кансерватыўна-Хрысціянскай партыі БНФ:

— 25 сакавіка паўторыцца мінулагодні сцэнар — людзей павядуць з плошчы Каліноўскага ў сквер Янкі Купалы. Так было ў 2006 годзе, і я лічу, што гэта здрада. А зараз увогуле са свядомасці беларусаў хочуць знішчыць нават назву свята. Ідзе грубая падмена паняццяў. Нацыянальнае свята — абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі — на нейкі дзень адзінства. І кампанія ўжо распачалася — выпушчаны ўлёткі, друкуюцца матэрыялы ў газетах. З кім праводзіць гэты дзень адзінства? З чалавекам, які вынішчае ўсё беларускае — мову, сімволіку, культуру?.. А ўвогуле я лічу, што ў беларусаў ёсць толькі адно сапраўднае свята — гэта Дзень волі.

Зміцер БАНДАРЭНКА, каардынатар грамадзянскай ініцыятывы "Хартыя-97":

— Усе апошнія гады свята 25 сакавіка афіцыйнай уладай не адзначалася. Больш за тое, удзельнікаў святкавання жорстка прэсінгавалі. Але мой прагноз такі — у гэтым годзе свята 25 сакавіка будзе больш падобна на дзяржаўнае свята, чым калі-небудзь. Я быў адным з ініцыятараў таго, каб гэтае свята адзначалі разам і прадстаўнікі апазіцыі, і прадстаўнікі ўлады. Ва ўладзе ёсць патрыятычныя людзі, якія разумеюць, што дзень 25 сакавіка павінен быць дзяржаўным святам. Я прыхільнік канцэптуальнага дыялогу паміж усімі зацікаўленымі асобамі. Праўда, ёсць апасенні, што такі дыялог паспрабуюць сарваць прарасійскія сілы, якія ёсць ва ўладзе.

Апытанне праводзіў Віталь ГАРБУЗАЎ.

ЗАКУЛІССЕ

Міратворцы

Мікола Статкевіч і Павел Севярынец, якія адбываюць пакаранне за арганізацыю вулічных дэманстрацый пратэсту супраць фальсіфікацыі вынікаў выбараў і рэферэндуму 2004 года, звярнуліся да лідэраў апазіцыйных партый і рухаў. Яны заклікалі іх адмовіцца ад узаемных публічных абвінавачанняў і паказаць адзінства напярэдадні вясновых вулічных акцый.

У сваім звароце Мікола Статкевіч і Павел Севярынец нагадваюць, што ў лістападзе 2004 года ўсе грамадскія лідэры дамовіліся не вінаваціць адзін аднаго ў прэсе, а весці канструктыўны дыялог дзеля агульнай мэты — усталявання дэмакратыі ў краіне.

У бліжэйшы час Рада беларускай інтэлігенцыі таксама паспрабуе паўплываць на сітуацыю сваім маральным аўтарытэтам. Прадстаўнікі дэмакратычных сіл фактычна самі папрасілі пра гэта кіраўніка Рады Уладзіміра Коласа, прызнаўшыся, што ніякага сумеснага дыялогу з камандай Мілінкевіча не атрымоўваецца. І сапраўды, нават на нядаўнюю сустрэчу ў Вільнюсе, на якой вырашаўся лёс Кангрэса дэмсіл і асноўных дакументаў, якія будуць на яго вынесены, не прыехаў ні сам Мілінкевіч, ні хтонебудзь з яго прадстаўнікоў. Магчыма, інтэлігенцыі ўдасца запэўніць вялікіх начальнікаў, што, ідучы такім шляхам, яны зацягваюць Беларусь у яшчэ большую бездань.

Ігар МАРОЗАЎ.

ПАЗІЦЫЯ

Павіншавалі ветэрана...

...З года ў год успамінаю тую зімовую ноч напрыканцы вайны, калі атрымаў сваё апошняе раненне. Разам са сваім узводам мы выконвалі загад — паставіць на нейтральнай паласе супрацьтанкавыя міны. Немцы нас заўважылі і адкрылі шалёны агонь, куля апякла мне правую руку...

Тое было 23 лютага 1945 года. І з тае пары гэты дзень, які прыпаў на колішні Дзень Чырвонай арміі, а цяпер — Дзень абаронцаў Айчыны, як бы ні мянялася наша стаўленне да самога гэтага свята, для мяне асабліва памятны і хвалюючы. Згадваю падзеі таго дня, сваіх сяброў па беларускай партызанцы і франтавых дарогах, з якімі ішоў у агонь. Многія сваімі жыццямі высцілалі шлях да Перамогі, не дайшоўшы да яе ўсяго некалькі крокаў.

Мне пашчасціла выжыць, і я лічу доўгам свайго сэрца ўвасобліваць іх подзвіг дзеля Радзімы ў сваіх вершах, артыкулах, публічных выступах. І гэтым разам, напярэдадні 23 лютага, перадаў у раённую газету "Прысожскі край" такі верш. Яго прынялі, абяцалі надрукаваць у святочным нумары. Але верш не выйшаў. "Так атрымалася", — вось і ўсё, што мне патлумачылі.

Ну добра, думаю, — не атрымалася дык не атрымалася. Сам прачытаю верш у раённым Доме культуры на святочным канцэрце, куды мяне раней заўжды запрашалі.

Але запрашэнне я ўпершыню не атрымаў. Павіншавалі, называецца, партызана і франтавіка. Не думаю, што з-за таго, што заяваў з 16 падлеткавых гадоў ці мала ўзнагарод маю — іх у мяне хапае. Прычына, як разумею, у іншым: я ніколі не хаваў і не хаваю сваёй свядомай грамадзянскай пазіцыі, дэмакратычных поглядаў і перакананняў. А сённяшняй уладзе не патрэбны людзі, якія думаюць сваёй галавой і адважваюцца адкрыта выказваць свае думкі, шануюць родную мову, культуру. Такія, па ўсім відаць, заносяцца ў "чорны" спіс "неблагонадежных" — ну ледзь не як у 1937-м. А я ж друкуюся ў незалежніцкіх выданнях — "Народнай волі", "Нашым слове". Логіка начальства як на далоні: колькі ж можна цярпець такога? Дзіўна, што дагэтуль неяк цярпелі.

Публікуюся яшчэ з савецкага часу ў рэспубліканскіх часопісах і газетах, выдаў сем кніг паэзіі і прозы. Мясцовае кіраўніцтва, відаць, добра парупілася, каб ні адна (!) з іх не трапіла ў сельскія і школьныя бібліятэкі раёна. Да якога лёкайства трэба апусціцца, каб такое ўзвесці ў норму?

Кажу пра "норму" ідэалагічнага ўціску, які ўкараняецца ва ўсім нашым жыцці і на ўсіх абсягах краіны. Днямі тэлефаную ў адно са сталічных **прыватных** выдавецтваў, дзе рыхтуецца (а можа, ужо і не рыхтуецца) да друку мая новая кніга. Рэдактарка, вельмі інтэлігентная, мілая жанчына, з якой мы добра разумеліся, раптам кажа: маўляў, той пісьменнік (вядомы, паважаны, таленавіты), які пагадзіўся напісаць прадмову да маёй кнігі, ну ніяк не падыходзіць. Ужо другога падабралі — дзеяча з чаргінцоўскага саюза...

Далей — болей:

— А вы, Фелікс Уладзіміравіч, ужо ўступілі ў новы пісьменніцкі саюз? Ну як жа, трэба, абавязкова трэба — вы ж будзеце там ударнай сілай!

Вось яно што, аказваецца: ужо і прыватныя, недзяржаўныя выдавецтвы пастаўлены пад дзяржаўнае ідэалагічнае "ружжо", займаюцца вярбоўкай жывых "штыкоў" для генерала Чаргінца. Я не маю такога высокага звання, але маю гонар і годнасць. Таму адказаў, разумеючы, якім будзе фінал гісторыі з выданнем маёй кнігі: падтрымліваў і падтрымліваю той пісьменніцкі Саюз, у якім былі Янка Купала і Якуб Колас, Пімен Панчанка і Максім Танк, Уладзімір Караткевіч і Васіль Быкаў. У якім зараз — найслынныя, найталенавітыя творцы Рыгор Барадулін, Ніл Гілевіч, Генадзь Бураўкін, адораная творчая моладзь...

Пасля размовы ўзяў аркуш паперы і напісаў новы верш, які прапаную ўвазе чытачоў "Народнай волі".

Фелікс ШКІРМАНКОЎ, інвалід Вялікай Айчыннай вайны.

г.Слаўгарад.

Ніхто не забыты...

Вянкі ускладалі
да помніка тым,
Хто ў бітвах загінуў,
стаў прахам зямным.
Удзячнасці словы
узнёсла гучалі,
Затым урачыста
хвіліну маўчалі.
Так ёсць, па традыцыі,
двойчы ў год
Збіраюць у калону
працоўны народ.
Усім зразумела,
хай будзе ўсім бачна,
Як паўшым героям
улада удзячна!

Удзячна, канешне,
яна і жывым,
Але... калі шчыра,
далёка не ўсім.
Здаўна завядзёнка,
было так заўжды:
Хто пляскае ў ладкі,
як пляскаў тады,
І сёння ў пашане,
яго заўважаюць
На святы ў прэзідыум
запрашаюць.
А той, хто пазіцыю
іншую мае,
Адразу у чорныя
спісы трапляе.

Ніхто не забыты!
Ўсіх помніць улада,
І робіць усё
Толькі так, як ёй "нада".

ЧУЛІ?

«Лукойл» б'е ў хамут...

Расійскі экспарцёр нафты кампанія "Лукойл" спыніла пастаўкі сыравіны паводле давальніцкіх схем на беларускія нафтаперапрацоўчыя заводы. Пра гэта паведамілі БелаПАН у прэс-службе нафтавай кампаніі.

"Мы адмовіліся ад перапрацоўкі ў Беларусі нафты на ўмовах працэсінгу (перапрацоўка давальніцкай сыравіны) — сёння гэта нам нявыгадна", — заявілі ў прэс-службе.

Разам з тым у кампаніі падкрэслілі, што пастаўкі нафты ў Беларусь не спыняюцца. У адпаведнасці з маршрутным даручэннем на адгрузку ў сакавіку "Лукойл" мае накіраваць у Беларусь 240.780 тон нафты. Ужо пастаўлена звыш 141 тысячы тон. "Гэтая нафта не была перапрацавана на давальніцкіх умовах, а рэалізавана прадпрыемствам канцэрна "Белнафтахім" і незалежным удзельнікам рынку", — адзначылі ў кампаніі.

У 2006 годзе на ўмовах працэсінгу "Лукойл" паставіў у Беларусь больш за 2 мільёны тон нафты, сёлета пастаўкі планавалася павялічыць да 4 мільёнаў тон, але з-за новых умоў працы на беларускім рынку кампанія вымушана была скарэкціраваць планы.

З пачатку 2007 года расійская нафта пастаўляецца ў Беларусь паводле формулы цаны, прывязанай да сусветнага трэнду. Яна фарміруецца на базе сярэдняй спотавай цаны партоў Амстэрдам — Ратэрдам — Антверпен у прымяненні да партоў Польшчы за вылікам транспартных выдаткаў (уключаючы партовы збор і фрахт танкераў). У лютым кошт тоны нафты для Беларусі з улікам усіх пошлін склаў 225 долараў.

Акрамя таго, падпісанае 12 студзеня ў Маскве міжурадавае пагадненне "Аб захадах па ўрэгуляванні гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва ў галіне экспарту нафты і нафтапрадуктаў" устанавіла экспартныя пошліны на нафтапрадукты, пастаўляемыя Беларуссю ў трэція краіны, а таксама пошліну на нафту, імпартуемую Беларуссю. У апошнім выпадку пошліну плацяць расійскія нафтавыя кампаніі.

Такія змены ўмоў працы, а таксама павышэнне ў Беларусі акцызаў на рэалізуемыя на ўнутраным рынку нафтапрадукты рэзка знізілі рэнтабельнасць расійскіх давальцаў нафтавай сыравіны.

Дагэтуль на ААТ "Нафтан" і ААТ "Мазырскі НПЗ" на давальніцкіх умовах пастаўлялі нафту "Лукойл", "Славнефть", "Сургутнефтегаз", "Русснефть", "Роснефть", кампаніі ЗП "Литаско-Белоруссия", ЗП "Юнивест-М", ЗП "Славнефтехим", ТАА "Трайпл", ЗП "Миралекс", СЗАТ "Белроснефть", "Сибтехносталь", "Паліўрэсурс", "ПраймексБелОйл", "Ітэрабелнафта".

Раней Расія і Беларусь дамовіліся перапрацаваць у 2007 годзе на двух беларускіх НПЗ 21,5 млн тон нафты — столькі ж, колькі ў 2006 годзе. Відавочна, што гэтыя планы аказаліся пад вялікім пытаннем.

Алена НАВАЖЫЛАВА.

СУД

Справа «пажарнікаў»: частка другая

12 сакавіка ў следчым ізалятары Гомеля аднавіўся закрыты судовы працэс па справе ўдзельнікаў крымінальнай групоўкі "Пажарнікі". Пра гэта карэспандэнту БелаПАН паведаміў начальнік ізалятара Уладзімір Гарахавік. Судовы працэс над 19 "пажарнікамі" быў прыпынены суддзёй абласнога суда Людмілай Грынько з прычыны захворвання на грып і прастуды многіх падсудных.

Гэта другая партыя "пажарнікаў", над якімі вядзецца суд ужо пяты месяц.

У мінулым годзе абласны суд вынес пакаранне першым 27 удзельнікам злачыннай групоўкі. Яны былі асуджаны на тэрмін ад 3 да 14 гадоў пазбаўлення волі.

Крымінальная групоўка "Пажарнікі" ўзнікла на тэрыторыі Гомельскай вобласці ў сярэдзіне 1990-х і існавала дзесяць гадоў. Члены групоўкі спецыялізаваліся на разбоях, крадзяжах, вымагальніцтве, падтрымцы прастытуцыі і незаконным аўтабізнесе. Агулам яны ўчынілі звыш 100 злачынстваў.

Праваахоўныя органы заяўляюць, што ў Расіі арыштаваны яшчэ дзесяць "пажарнікаў", у ліку якіх галоўныя кіраўнікі злачыннай банды — 35-гадовы **Генадзь Бярэзін**, а таксама яго актыўныя памагатыя — **Алег Чыркоў** і **Вячаслаў Ліцэнштэйн**. У іх былі канфіскаваны падробленыя пашпарты грамадзян Расіі і Беларусі.

Анатоль ГАТОЎЧЫЦ.

ОСТРАЯ ТЕМА

Кто поделил пенсионеров на «два сорта»?

Публикации на пенсионную тему в последних номерах газеты вызвали широкий резонанс и острую полемику. Ниже — продолжение темы.

Найдется ли место моему мнению?

Редакция пригласила своих читателей к серьезной, глубокой дискуссии на пенсионную тему. Могу заранее сказать, что серьезной дискуссии не получится. Весь разговор сведется к нытью: какие у нас нищенские пенсии и как нам тяжело живется. А также к требованию отнять "большие" пенсии у военных. Но мы это уже проходили. И чем заканчиваются такие дискуссии, какие результаты дали?

Почему-то нападки идут именно на военных, людей высокообразованных, составляющих элиту общества каждого государства, заслуженно получающих ***не намного*** *выше пенсии, чем гражданские. И достойны получать действительно высокие пенсии.*

У меня сложилось мнение, что чья-то умелая рука направляет подобные дискуссии в нужное ей русло, чтобы вызвать у несведущих людей неприязнь к сословию военных... Не надо противопоставлять одну часть общества другой и не возбуждать низменные чувства. Нужно объединяться и требовать всеми законными методами от власть предержащих своего законного, конституционного права на достойную старость.

Ну что, Иосиф Павлович, найдется моему мнению место на страницах Вашей газеты?

С уважением —

Людмила ВАЛЬКО.

г.Барановичи.

Как видите, нашлось...

Как видите, уважаемая читательница, место вашему мнению нашлось. Мы благодарим вас за внимание к нашей газете и за желание вступить в дискуссию.

Мы согласны с вами, что не надо делить и противопоставлять одну часть общества другой. Но оно, к сожалению, уже поделено. И это хорошо видно на примере пенсионеров. Есть чиновники-пенсионеры с большими пенсиями и все остальные —- с маленькими пенсиями.

Скажите, почему пенсия строителя, который в дождь и мороз на высоте поднимает вверх этажи, должна быть в два-три раза меньше, чем министерского клерка? Неужели труд доярки, комбайнера менее важен, что он оплачивается намного ниже? Почему разные работники, выходя на заслуженный отдых, оказываются в неравных условиях? В ведущих, цивилизованных странах практически все равны при расчете пенсий — пенсия составляет примерно 70 процентов от заработка.

Уважаемая Людмила Валько! Согласны с вами и в том, что гражданам *"стоит объединиться и требовать всеми законными методами от власть предержащих своего законного права на достойную старость".*

Теперь, что касается результатов дискусии. Наше дело информировать читателей о том, что происходит в обществе. А по поводу результатов, видимо, стоит задуматься, почему власти не реагируют на болевые процессы в обществе и тех ли мы избрали в органы власти?

Гэты здымак зроблены на гарадскім рынку ў Баранавічах. Пажылыя людзі, каб звесці канцы з канцамі, вымушаны гандляваць хто чым можа.

Фота photo.bymedia.net

За што прыкормлены ўладай?

Відаць, ніхто не стане абвяргаць той факт, што нашы пенсіянеры падзелены на багатых і бедных. Адны з іх не ўяўляюць сабе, як гэта можа не хапаць грошай, а другія ледзьледзь зводзяць канцы з канцамі, адмаўляючыся ад самага неабходнага.

Чаму людзі, блізкія да ўлады, добра прыкормлены ёю? За што так зняважана праца хлебаробаў і прамыслоўцаў, што іх пенсіі намнога меншыя, чым у чыноўнікаў?

Несправядліва робіцца і павышэнне пенсій. Іх павялічваюць, скажам, на 10 працэнтаў. У каго яна мільён рублёў, значыць, атрымае дабаўку 100 тысяч, а ў каго — 300 тысяч, дык дабаўка будзе ў тры разы меншая.

Калі б улада не на словах, а на справе клапацілася аб дабрабыце народа, дык у такой складанай эканамічнай абстаноўцы, як цяпер, не будавала б спадарожнік, помнік Суораву, не выдзяляла б столькі сродкаў на прапаганду, "Дажынкі", лінію Сталіна і гэтак далей. Многае магло б пачакаць. А накіроўвала б сродкі на будаўніцтва жылля ды на пенсіі. Пакуль жа нас улада любіць і цэніць толькі па тэлевізары, радыё і ў СМІ. Тут яна нізка нам кланяецца і гаворыць, што ў даўгу перад народам. Вось толькі не кажа, калі доўг гэты аддаваць будзе.

Максім ЛЫЧ.

г.Светлагорск.

ПОДРОБНОСТИ

«Черный континент» белорусской авиации

Самолет "Ил-76" белорусской транспортной авиакомпании "Трансавиаэкспорт" при захо де на посадку в столице Сомали Могадишо вблизи международного аэропорта на высоте 150 м етров был обстрелян с земли и поражен. Выстрел пре дположительно произведен из ручного гранатомета. Самолет удалось посадить. Все члены экипажа живы.

Эта сухая и скупая информация была в минувший понедельник опубликована на лентах практически всех белорусских информагентств. Ни в Департаменте по авиации, ни в Министерстве транспорта и коммуникаций более подробную информацию получить не удалось. Известно лишь, что самолет "Трансавиаэкспорта" перевозил гуманитарные грузы в рамках миротворческой миссии, осуществляемой в Сомали силами Африканского союза под эгидой Организации Объединенных Наций. После информации об инциденте в Сомали вылетели комиссия белорусских специалистов и представители страховых компаний.

Как ни парадоксально, но ЧП с белорусским самолетом где-то в Восточной Африке отнюдь не кажется странным. В последнее десятилетие летчик нашей транспортной авиации — пожалуй, одна из самых рискованных профессий. Ведь если перефразировать рекламный слоган одной туристической фирмы, *"белорусы летают там, где не хотят летать другие".*

Мировые "горячие точки" давно уже стали вотчиной наших пилотов. Прочувствовав в начале и середине 1990-х, что такое сидеть без заказов, белорусские авиапредприятия стали заключать контракты, от которых отказывались другие компании. С тех пор список авиакатастроф и других инцидентов с участием наших самолетов и пилотов стал расти как снежный ком. Вот самые известные из них, которые произошли в одной лишь Африке:

1997 г. Два белорусских вертолетчика, работавших в Сьерра-Леоне, вскоре после очередного путча были взяты в плен новыми властями.

1998 г. Из-за отказа одного двигателя и возгорания второго в 85 километрах от Луанды упал на землю "Ан-12", принадлежащий белорусской компании "ТехАвиаСервис" и работавший в Анголе по контракту. Погибли 13 человек, в том числе 5 белорусов — членов экипажа. Не исключается возможность диверсии.

2003 г. Самолет "Ту-154" авиакомпании "Гомельавиа" простоял в аэропорту столицы Нигерии Лагосе более месяца. Заказчик — нигерийская компания — не смог найти пассажиров на обратный рейс в Беларусь, в связи с чем летчики удерживались в Нигерии. Все это время экипаж находился в местном отеле в ожидании возможности вылететь на родину. Ситуация разрешилась после того, как авиакомпания "Гомельавиа" перечислила 25 тысяч долларов за нахождение в отеле и 5 тысяч долларов на дозаправку для обратного вылета.

2004 г. В Кот-д'Ивуаре неделю удерживался под стражей экипаж транспортного самолета "Ан-12", в составе которого было 15 граждан СНГ. Четверо из них являлись гражданами Беларуси. Представители французских властей обвинили наших соотечественников в пилотировании "Су-25", осуществивших удары по французским подразделениям.

2005 г. В трех авиакатастрофах на Африканском континенте погибли 10 белорусов. Самая крупная катастрофа произошла в Танзании, когда транспортный "Ил-76" сразу после взлета упал в озеро Виктория. Погибли 6 граждан Беларуси.

После этого МИД нашей страны не рекомендовал белорусским летчикам принимать предложения зарубежных авиакомпаний без заключения договоров и страховых полисов. В распространенном внешнеполитическим ведомством заявлении было сказано, что условия работы, которые предоставляют африканские компании, не всегда соответствуют международным нормам. Зачастую летчики работают без контрактов и страховок. А самолеты, на которых приходится летать, давно выработали свой ресурс. Африканский континент по числу авиакатастроф занимает одно из первых мест в мире. С 1995-го по 2005 год здесь зарегистрировано 210 крушений. Однако в рекомендациях не было сказано, где брать деньги, если в Беларуси контрактов нет.

Александр ДАУТИН,
Reuters.

СНОВА О САЛЬДО

Вот это можете прочесть

Товарооборот Республики Беларусь со странами СНГ в 2006 году по сравнению с прошлым увеличился на 27%, экспорта — на 22%, импорта — на 30,1%.

По итогам 2006 г. товарооборот Республики Беларусь с Российской Федерацией увеличился на 25,9%, экспорт — на 19,8% и импорт — на 29,3%.

Наиболее существенный рост был отмечен в отношении экспорта тракторов и седельных тягачей, грузовых автомобилей, проводов изолированных и кабеля, шин, дорожной техники, мебели, холодильников и морозильников, прицепов и полуприцепов и других товаров. Стабильно возрастает экспорт мясных и молочных продуктов.

Наибольшие стоимостные приросты импорта приходятся на поставки нефти, нефтепродуктов, природного газа, отходов и лома черных металлов, проволоки медной, каучука синтетического, обуви кожаной.

Это, конечно, хорошо. Но что же в итоге наторговали? Где один из основных показателей — сальдо? Он куда-то исчез из этого сообщения, размещенного на сайте Минэкономики. Видимо, уже перестроились в свете новых подходов в работе со СМИ? Ведь оно, это сальдо, сильно портит всю статистику. Так, со странами СНГ оно отрицательное в сумме 5,8 миллиарда долларов, с Россией — 6,2 миллиарда долларов. Ну зачем портить настроение читателям, которые, чего доброго, еще задумаются: а так ли надо торговать?

Вот другое дело — торговля с Казахстаном. Здесь сальдо положительное в размере 187,8 млн долларов США и выросло по сравнению с соответствующим периодом прошлого года на 35,4 млн долларов США. Вот это, пожалуйста, читайте.

Сергей ПЕТРОВ.

Сямёрка выйшла на другі этап

Сем прадпрыемстваў Беларусі выйшлі на другі этап конкурсу на суісканне прэміі СНД за дасягненні ў галіне якасці прадукцыі і паслуг за 2006—2007 гады. Пра гэта БелаПАН паведамілі ў прэс-службе Дзяржстандарта.

У другі этап конкурсу выйшлі адкрытае акцыянернае таварыства "Мазырскі нафтаперапрацоўчы завод", рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства "Беларускі металургічны завод", прыватнае унітарнае машынабудаўнічае прадпрыемства "КОМПО", таварыства з абмежаванай адказнасцю "Вегас", СП "ЗАТ "Мілавіца", адкрытае акцыянернае таварыства "Савушкін прадукт" і беларуска-расійскае сумеснае прадпрыемства "ААТ "Брэстгазаапарат". Усяго заяўкі падалі 13 прадпрыемстваў.

Прадукцыя гэтых прадпрыемстваў, адзначылі ў Дзяржстандарце, добра вядомая на рынках краін блізкага і далёкага замежжа, адрозніваецца высокай якасцю, адпавядае міжнародным і еўрапейскім стандартам і запытам спажыўцоў.

Усяго ў другім этапе конкурсу ўдзел бяруць 30 арганізацый, якія прадстаўляюць Азербайджан, Беларусь, Казахстан, Расійскую Федэрацыю, Таджыкістан і Украіну.

Рашэнне аб прысуджэнні прэміі будзе прымацца на пасяджэнні Эканамічнага савета СНД. Вынікі конкурсу стануць вядомыя ў канцы 2007 года. Лаўрэатам будуць уручаны дыпломы і прызы, а таксама прадастаўлена права выкарыстання эмблемы прэміі ў рэкламных мэтах на працягу трох гадоў.

Марына НОСАВА.

Даешь счетчики!

Для перехода на дифференцированную систему учета электроэнергии необходимо свыше 500 млн долларов. Об этом сообщил первый заместитель премьер-министра Беларуси Владимир СЕМАШКО в Витебске в ходе выездного заседания Комиссии по повышению конкурентоспособности экономики, на котором рассматривался вопрос внедрения автоматизированных систем контроля и учета электроэнергии бытовых потребителей (АСКУЭ-быт) отечественного производства.

По его словам, внедрение многотарифного учета электроэнергии позволит равномерно распределить ее потребление. Оптимизация нагрузок снимет необходимость останавливать энергетические блоки в ночное время, что в свою очередь снизит экономические потери и, соответственно, износ оборудования. Для энергетиков и экономики в целом ее внедрение позволит сократить штат контролеров, вести точный учет потребления, своевременно выявлять потенциальных должников и технические неисправности.

Отработка технологии применения многотарифных счетчиков за истекший период времени не только доказала эффективность их применения, но и выявила ряд недостатков, связанных прежде всего с надежностью работы таких счетчиков. Отечественным производителям необходимо доработать технологию выпуска многотарифных счетчиков с учетом повышения надежности и снижения себестоимости. Данная информация содержится на сайте Совмина.

Евгений ТАВГЕНЬ.

АКТУАЛЬНАЯ ТЭМА

Указ ёсць, праблемы застаюцца

Указ прэзідэнта №119 ад 9 сакавіка 2007 года "Аб спрошчанай сістэме падаткаабкладання" не вырашыць усіх праблем індывідуальных прадпрымальнікаў. Гэта меркаванне незалежнага эксперта, актывіста прадпрымальніцкага руху Сяргея Балыкіна.

"Несумненна, ва ўказе можна адзначыць шэраг станоўчых момантаў, — заявіў С.Балыкін у гутарцы з карэспандэнтам БелаПАН. — *Напрыклад, з 15 да 100 павялічана колькасць работнікаў суб'ектаў малога прадпрымальніцтва. Дробныя прадпрыемствы з колькасцю працаўнікоў да 15 чалавек могуць весці бухгалтарскі ўлік паводле спрошчанай формы. Але асноўным у дакуменце стала адмена неабходнасці набыцця патэнту, якая раней стрымлівала пераход малых прадпрыемстваў на спрошчаную сістэму падаткаабкладання".*

Разам з тым незалежны эксперт зазначыў, што ўказ №119 не адмяняе фактычнае ўвядзенне з 1 студзеня 2008 года забароны для індывідуальных прадпрымальнікаў на выкарыстанне наёмнай працы. "А гэта і з'яўляецца асноўнай праблемай ІП сёння", — падкрэсліў С.Балыкін.

Нагадаем, што ўказам прэзідэнта №285 ад 18 чэрвеня 2005 года "Аб некаторых мерах па рэгуляванні прадпрымальніцкай дзейнасці" з улікам змяненняў, унесеных у яго ўказам № 760 ад 29 снежня 2006 года, уведзены абмежаванні для ІП, што ажыццяўляюць дзейнасць з прыцягненнем працы наёмных работнікаў, — з 1 студзеня 2008 года дзейнасць індывідуальнага прадпрымальніка можа ажыццяўляцца толькі з прыцягненнем членаў сям'і і блізкіх сваякоў у колькасці трох чалавек.

"Для многіх ІП "трансфармацыя" ў юрыдычную асобу непрымальная па цэлым шэрагу прычын, — лічыць С.Балыкін. — *Напрыклад, індывідуальныя прадпрымальнікі, зрабіўшыся юрыдычнай асобай, пазбаўляюцца магчымасці аператыўна манеўраваць сваімі грашовымі сродкамі, пераводзячы іх з асабістых у абаротныя і назад. Стварэнне юрыдычнай асобы ўсё-такі вымагае ад ІП афармлення даволі вялікай колькасці дакументаў, што для іх будзе не пад сілу".*

Незалежны эксперт лічыць, што ўказ, "несумненна, дасць нейкую карысць, але вельмі невялікаму колу суб'ектаў гаспадарання". Паводле яго слоў, найперш пакарыстацца перавагамі спрошчанай сістэмы падаткаабкладання змогуць юрыдычныя асобы, якія займаюцца аказаннем паслуг, напрыклад, у будаўніцтве, бытавым абслугоўванні або грамадскім харчаванні. "Па вартасцях ацэняць указ "прафесіяналы ў сферы пераводу грошай у наяўныя сродкі і падатковага планавання", але асноўнай масе прадпрымальнікаў новы ўказ не дапаможа", — дадаў С.Балыкін.

На яго думку, "лічыць крокам наперад указ прэзідэнта можна было б пры адной умове: калі б прадпрымальнікам далі магчымасць свабоднага выбару і ўлада не заганяла б іх сілай у юрыдычныя асобы". *"Але, на жаль, Беларусь — гэта краіна ўсялякіх кампаній, і цяпер ідзе кампанія, якая прымушае ІП ствараць юрыдычныя асобы",* — канстатаваў незалежны эксперт.

Вячаслаў БУДКЕВІЧ.

Указ прэзідэнта №119 "Аб спрошчанай сістэме падаткаабкладання", прымусіць індывідуальных прадпрымальнікаў (ІП) сысці ў цень. Пра гэта ў інтэрв'ю БелаПАН заявіў старшыня рэспубліканскага грамадскага аб'яднання "Перспектыва" Анатоль Шумчанка.

"Магчыма, гэты ўказ вырашыць нейкія кароткатэрміновыя праблемы напаўнення беларускага бюджэту, але што тычыцца інвестыцый у эканоміку з боку ІП, то гэтага не будзе. Дакумент скіраваны на аслабленне прадпрымальніцкай ініцыятывы і прымушае ІП "сыходзіць у цень", гэта значыць заніжаць памеры выручкі, каб плаціць больш нізкія падаткі", — лічыць А.Шумчанка.

На яго думку, сёння ў індывідуальных прадпрымальнікаў няма стымулаў паказваць свае расходы, заканадаўства не дае перадумоў для пераходу ІП у юрыдычныя асобы. *"Не атрымаецца ўказамі і дэкрэтамі перавесці нас у юрыдычныя асобы. Для гэтага патрэбны час, але ён не надыдзе ніколі, калі ўлада не будзе раіцца з індывідуальнымі прадпрымальнікамі і выпрацоўваць сумесную стратэгію развіцця прадпрымальніцтва",* — сказаў А.Шумчанка. Ён не выключае, што ўказ пралабіраваны ўладальнікамі гіпермаркетаў або буйным бізнесам, а для ІП насамрэч ніякага спрашчэння падаткаабкладання дакумент не нясе. Паводле слоў Шумчанкі, нягледзячы на тое што ўказ пакідае адзіны падатак толькі для ІП, якія працуюць без наёмных асоб, прадпрымальнікі "да апошняга паспрабуюць выкарыстаць схему адзінага падатку, таму што гэта адзіная магчымасць больш-менш існаваць, працаваць і развівацца".

А.Шумчанка ўпэўнены, што чыноўнікі, якім даюць даручэнні выкарыстаць прадпрымальніцкі патэнцыял для вырашэння эканамічных праблем, "паказваюць бесперспектыўнасць сваёй дзейнасці, бо не прыцягваюць для гэтага прадстаўнікоў прадпрымальніцкай супольнасці". *"Таму цяпер, ва ўмовах новай эканамічнай рэальнасці, краіне неабходны новыя людзі, новыя спецыялісты для вырашэння гэтых задач",* — лічыць лідэр "Перспектывы".

Генадзь ШАРЫПКІН.

ФОТООКНО

Митинг предпринимателей на площади Бангалор в Минске 12 марта 2007 года.

Китай: *84 тысячи акций протеста*

Промышленный рост Китая последние 4 года измеряется двузначным числом. В прошлом году ВВП страны увеличился на 10,7%. Такие темпы становятся несоразмерными с возможностями человеческих и природных ресурсов азиатского гиганта.

Два десятилетия либерализации экономики Китая создали новые проблемы, одна из которых — массовая безработица. Количество людей, не имеющих работы, составляет 84 миллиона в городах, 100 миллионов в деревне. Ежегодно 1 миллион 400 тысяч новых выпускников вузов не находят себе применения.

За 20 лет 10% жителей Китая сконцентрировали в своих руках 40% национального богатства. Разница доходов наиболее богатых и наиболее бедных растет, превысив аналогичный показатель капиталистических стран с наиболее либеральной экономикой, в том числе и США.

Сельское население Китая наиболее пострадало от экономического бума. По данным Коммунистической партии, 23 миллиона 700 тысяч жителей деревень нуждаются в помощи. При том что 800 тысяч крестьян не имеют права на бесплатную медицинскую помощь.

Обязательное девятилетнее образование также не бесплатно. В 2006 году КПК была вынуждена взять на себя расходы на образование в сельскохозяйственных районах страны.

Все эти проблемы вызывают растущее недовольство населения: в прошлом году в стране прошло 84 тысячи акций протеста, многие были связаны с незаконным отчуждением сельхозяйственных земель.

Кроме всего прочего китайским крестьянам постоянно угрожает нехватка воды. 70% ее источников загрязнены, поскольку используются промышленностью. К тому же потепление климата провоцирует таяние ледников и вызывает все более частые засухи. Об этом сообщает "Euronews".

СЛЫШАЛИ?

Банк Апокалипсиса

Начались работы по сооружению самого большого и надежного банка растений в мире

Он будет создан под землей в зоне вечной мерзлоты на острове Шпицберген, входящем в состав норвежского архипелага, расположенного ближе всех островов к Северному полюсу. В сентябре банк будет готов и к концу зимы 2008 начнет функционировать. Его также называют "хранилищем Апокалипсиса". Об этом сообщает издание CORRIERE DELLA SERA.

Целью сооружения этого банка является хранение в условиях вечной мерзлоты набора семян, имеющих первостепенное значение для стран всего мира. К числу угроз относятся не только болезни, изменения климата и природные катастрофы, но и возможные катаклизмы, такие как ядерная война, столкновение с астероидом, различные инциденты и плохие системы ведения сельского хозяйства.

В настоящее время семена самых важных в мире культур хранятся в 1400 генных банках, расположенных на всех континентах, но они считаются не очень надежными, отсюда и тревога за выживание многочисленных видов, считающихся уникальными. А вот банк Апокалипсиса может пережить и более страшные катастрофы. Он расположен на высоте 130 метров над уровнем моря, что позволит ему остаться на поверхности даже при самом неблагоприятном развитии событий, если даже начнут таять все льды и уровень моря поднимется на 61 метр.

В банке имеются свыше 100 тысяч сортов риса, и ученые надеются сохранить все эти виды. Семена некоторых растений, как горох, например, могут храниться в замороженном виде всего 20—30 лет, но другие, как семена подсолнечника или других видов злаков, могут храниться многие десятки и даже сотни лет. В любом случае после периодических проверок семена еще до того, как они утратят способность к прорастанию, будут извлечены из хранилища и посеяны, чтобы выросшее растение смогло производить новые семена и увековечить каждый конкретный вид.

ЧТО НОВОГО?

«Зеленые» автомобили

"Зеленые" технологии — одна из главных тем очередного слета гигантов автомобильной индустрии в швейцарской Женеве

Выставленные здесь новые модели просто крик о стремлении европейских автомобилестроителей соответствовать меняющимся требованиям публики и новым законодательным инициативам Старого Света, направленным на сохранение экологии и борьбу с глобальным потеплением.

Немецкие фирмы Mercedes и BMW, ставшие в последнее время объектами жесткой критики за то, что их машины производят углекислоты больше среднестатистических показателей, наносят ответный удар: их инженеры предлагают новые "зеленые" идеи. Но тон здесь по-прежнему задают японцы — Toyota и Honda, которые уже замахиваются на спортивные модели, оснащенные гибридными бензиново-электрическими двигателями.

Небольшие европейские производители, такие как Fiat, тоже увидели для себя преимущества в новых технологиях, направленных на сбережение топлива.

Почувствовав эту перемену в настроении потребителей и производителей, готовых поставлять и покупать меньшие по размеру автомобили, Renault и Volkswagen предлагают более объемистые версии своих популярных моделей. На эту ярмарку они привезли своих универсалов Clio и Golf.

